Весці БДПУ

Штоквартальны навукова-метадычны часопіс.
Выдаецца з чэрвеня 1994 г.

№ 3(53) 2007

СЕРЫЯ 2.
Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія.
Эканоміка. Культуралогія

Змест

Галоўны рэдактар:
П. Дз. Кухарчык

Рэдакцыйная калегія:
Н. Г. Алоўнікава
А. І. Андарала
(*нам. галоўнага рэдактара*)
У. В. Амелькін
В. А. Бондар
М. К. Буза
В. В. Бушчык
(*нам. галоўнага рэдактара*)
Ю. А. Быкадораў
(*нам. галоўнага рэдактара*)
І. В. Бялько
А. М. Вітчанка
С. Я. Гайдукевіч
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
В. М. Дабранскі
Л. М. Давыдзенка
А. В. Данільчанка
М. М. Забаўскі
В. Б. Кадацкі
Я. Л. Каламінскі
У. М. Калюноў
Л. В. Камлюк
Л. А. Кандыбовіч
І. В. Катляроў
П. В. Кікель
Г. А. Космач
У. М. Котаў
Н. І. Кунгурава
М. В. Лазаковіч
І. Я. Левяш
М. І. Лістапад
А. М. Люты
У. А. Мельнік
І. А. Новік
В. М. Русак
А. І. Смолік
В. Дз. Старычонак
В. Б. Таранчук
А. І. Таўгень
І. С. Ташлыкоў
В. М. Фамін
А. Т. Федарук
А. С. Цернавы
Л. Н. Ціханаў
І. І. Цыркун
М. Г. Ясавееў

Гісторыя

Самусік А.Ф. Становішча адукацыйнай справы на беларускіх землях у канцы XVIII – пачатку XIX ст. 3

Пілецкі В.А. Вырашэнне актуальных праблем адукацыйна-выхаваўчага працэсу ў Беларусі (канец XIX – пачатак XX ст.) 8

Шаўчук І.І. Студэнты-гуманітарыі БССР (1920–1930-я гг.): сацыяльна-дэмаграфічны агляд 12

Янкоўская Т.У. Эвалюцыя маладзежнага руху ў Беларусі (канец XX – пачатак XXI ст.) 17

Забаўскі М.М. Расійскае самаўладдзе ў перыяд сацыяльных і палітычных узрушэнняў (1914–1917 гг.) 20

Пуцік У.С. Указ аб верацярпімасці і актывізацыя грамадска-палітычнай дзейнасці рэлігійных канфесій ў Беларусі 24

Люты А.М., Лютая А.Э. Статуты ВКЛ (1529, 1566, 1588 гг.) – крыніцы па гісторыі запрыгоньвання сялян у XVI ст. 28

Кадзіра У.М. Беларуская і ўкраінская гістарыяграфія праблемы антыфеадальнай барацьбы ў другой палове XVI – першай трэці XVII ст. 32

Вялікая В.А. Ажыццяўленне харчовай праграмы ЮНРРА ў Беларусі (1945–1947 гг.) 35

Салькоў А.П. Балгара-югаслаўскія тэрытарыяльныя супярэчнасці ў савецкай палітыцы на Балканах (1941–1945 гг.) 37

Варывончык І.В. Палітыка кіруючых адміністрацый і тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця ЗША (канец XX – пачатак XXI ст.) 42

Субоцін А.Г. «Удар па Прусіі». Да гісторыі імперскай экзекуцыі 20 ліпеня 1932 г. у Германіі 46

Філасофія

Новікаў В.М. Гістарычны выбар Беларусі ў кантэксце сучасных ідэалагічных працэсаў 51

Крыштаповіч А.А. Адкрытае грамадства: метадалогія сацыяльнай пабудовы 56

Паліталогія

Зенчанка В.А. Праблемы мадэрнізацыі палітычнай сістэмы грамадства: гістарычны вопыт і сучаснасць 60

Канапацкі М.Б. Кемалізм і праблема развіцця свецкай дзяржавы 63

Лысюк А.І. Імідж палітычнага лідэра ў працэсах культуралагічнай ідэнтыфікацыі 66

Казырэнка Н.П. Асаблівасці палітычнай культуры пераходнага грамадства 69

Новікава С.І. Развіццё ідэй і ўяўленняў аб праве і справядлівасці: ад антычнасці да праектаў сацыялістаў-утапістаў 72

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

чым асобныя аўтарытарныя і нават таталітарныя рэжымы. Аб гэтым сведчаць, у прыватнасці, гібельныя вынікі прыняцця ліберальнай мадэлі дэмакратызацыі і рэфармавання для СССР, падзеі на Украіне пасля «аранжавай» рэвалюцыі, якая прывяла да перманентнага крызісу ўлады, расколу грамадства, стагнацыі эканомікі.

У той жа час у гісторыі шмат прыкладаў, калі манархіі, ваенныя хунты і іншыя аўтарытарныя рэжымы рабілі для эканамічнага росквіту, павышэння дабрабыту, умацавання бяспекі грамадзян і гарантавання іх індывідуальнай свабоды, а таксама справядлівага размеркавання вынікаў працы значна больш, чым слабыя або карумпіраваныя дэмакратычныя ўрады.

Такім чынам, палітычная мадэрнізацыя грамадства – не аднаразовы акт, а даволі працяглы працэс, які ў розных краінах займае розныя часавыя перыяды.

Літаратура

1. *Гонсалес, Ф.* Создать в обществе основу для соглашения и перемен / Ф. Гонсалес // Свободная мысль. – 1995. – № 15. – С. 79–91.
2. «Три консенсуса» на пути к демократии // Полис. – 1993. – № 3. – С. 188-191.

Summary

On the basis of the use of history experience's theoretical and empirical analysis we observe problems of modernization of the society's political system in contemporary circumstances. We note, that modernization's success is conditioned not by blind copying of western model of democracy, but by harmonious use of traditions and innovations, civilization's and national principles, with the regard of progressive experience and concrete reality of certain country. We substantiate the main conditions and objective laws of effectiveness of society's political modernization.

УДК 322

М.Б. Канапацкі

КЕМАЛІЗМ І ПРАБЛЕМА РАЗВІЦЦЯ СВЕЦКАЙ ДЗЯРЖАВЫ

Апошнія гады многія постсавецкія краіны ў пошуках стварэння асноў дзяржаўнасці звяртаюцца да ідэалогіі. Такая мадэль развіцця нацыянальнай дзяржавы мяркуе сінтэз пэўных ідэалагічных каштоўнасцей і нацыянальнай традыцыі.

Вопыт развіцця турэцкай дзяржавы з'яўляецца прыкладам для цюркамоўных дзяржаў. Сучасная турэцкая дзяржава пераймае традыцыі мінулага і на іх аснове развівае сваю унікальную мадэль развіцця. У аснову традыцыі пакладзены іслам, які цэментуе турэцкае грамадства і ў спалучэнні з кемалізмам абумоўлівае фарміраванне нацыянальнай мадэлі свецкай дзяржавы.

Заснавальнік турэцкай рэспублікі Мустафа Камаль заклаў трывалыя асновы турэцкай дзяржавы і абгрунтаваў асноўныя прынцыпы кемалізму. У навуковых колах сучаснай Турцыі парознаму ацэньваюць кемалізм. Некаторыя, як напрыклад, Ментэр Шахінлер, лічаць, што кемалізм уяўляе сабой сістэму рэвалюцыйных пераўтварэнняў турэцкага грамадства [1].

Асобныя даследчыкі пагаджаюцца з замежнымі аўтарамі, якія разглядаюць кемалізм як ідэалогію. Іншыя мяркуюць, што кемалізм – гэта рух, які непасрэдна звязаны з яго заснавальнікам Атацюркам. «Такая позиция, – сцвярджае Ментэр Шахінлер, – сведение всего движения к единичному явлению невозможна. Она отрицает возможность заимствования, распространения на другие мусульманские страны. Она умаляет роль сподвижников и всего турецкого народа в преобразовании турецкого общества» [2].

На думку Жэрара Тангаса, арыгінальнасць кемалізму заключаецца ў стварэнні новага метаду хуткага сацыяльнага развіцця, што не сумяшчальна з філасофскімі законамі французскага рэжыму. Ён лічыць кемалізм даволі станоўчай і вельмі папулярнай філасофіяй, таму што яна не спыняецца на тэарэтычным сцвярджэнні сваіх прынцыпаў, а жыве натуральным і незалежным жыццём [3].

Упершыню тэрмін «кемалізм» быў уведзены ў навуковы абарот у 1920 г. брытанскім камісарам дэ Рабекам для характарыстыкі паплечнікаў Атацюрка. З гэтага моманту кемалізм некаторымі даследчыкамі разглядаецца не як ідэалогія, а як рух, які ацэньваецца згодна пазіцыі аўтара.

Традыцыя першаступеннай ролі султана-халіфа дазволіла ўбачыць у Атацюрку героя-выратавальніка нацыі. Кемалізм абвясціў ідэі дэмакратыі і народнага суверэнітэту як асноватворныя каштоўнасці. Гэтыя ідэі прадвызначылі праграму стварэння асноў новай палітычнай сістэмы. Кемалізм як ідэалогія сфарміраваўся пад уплывам ідэй пазітывізму А. Конта, Вялікай французскай буржуазнай рэвалюцыі і рэвалюцыі ў Расіі. Кемалізм, выкарыстоўваючы канцэпцыю салідарнай адказнасці, якая меркавала вяршэнства навукі над традыцыяналізмам, абгрунтоўвае прынцып народнасці, стварэнне бясклясавага грамадства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Рэвалюцыя ў Расіі спрыяла збліжэнню кемалізму і марксізму-ленінізму. Яна паказала падабенства і блізкасць дзвюх палітычных мадэлей развіцця. Па-першае, гэта падабенства гістарычных умоў сацыяльнай базы рэвалюцыйных пераўтварэнняў. Па-другое, выкарыстанне палітычнай партыі і бюракратыі як апоры палітычнага рэжыму і ідэалагічнага цэнтра. Па-трэцяе, выкарыстанне насілля, рэпрэсій як сродку для дасягнення пастаўленай мэты.

У 1923 г. Турцыя была аб'яўлена рэспублікай. Новая форма праўлення сцвярджала дэмакратыю (урад народа, выбраны народам і дзейнічаючы ў інтарэсах народа). Турэцкі народ атрымаў новую мадэль палітычнай сістэмы. Кемалізм увёў ва ўжытак такія паняцці, як «урад народа», «прадстаўнічы орган народа», «улада народа».

На самай справе турэцкі народ не валодаў ніякай уладай. Прынцыпы кемалізму не прадугледжвалі ніякіх прэферэнцый, пераваг класа, слоя, эліты на прадмет палітычнай улады. Рэальная ўлада канцэнтравалася ў руках Атацюрка. Быў заснаваны вышэйшы орган дзяржаўнай улады – Нацыянальны сход, які здзяйсняў паўнамоцтвы заканадаўчай, выканальніцкай і судовай улады. Кіраўнік дзяржавы з'яўляўся адначасова і лідэрам Народна-рэспубліканскай партыі. Дэпутаты Нацыянальнага схода выбіраліся не шляхам волевыяўлення народа, а на партыйных з'ездах. Дэпутаты, якім афіцыйна было даручана фарміраваць урад, былі «выбраны», а не прызначаны без якой бы то ні было магчымай канкурэнцыі.

У пачатку 30-х гг. адбываецца кансалідацыя кемалісцкай ідэалогіі. Народна-рэспубліканская партыя ўключыла ў сваю праграму чатыры асноватворныя прынцыпы кемалізму: народнасць, лаіцызм, нацыяналізм і этатызм. У праграме гаварылася, што прыхільнікамі прынцыпу народнасці трэба лічыць тых, хто прымае абсалютную роўнасць перад законам і адмаўляе ўсе прывілеі якога б то ні было асобнага чалавека, сям'і, класа ці грамадства. Кемалізм разглядаў народ не ў якасці асобнага класа грамадства, а як супольнасць, якая складаецца з розных прафесійных груп, згодна патрэб падзелу працы на карысць чалавека і сацыяльнага жыцця турэцкага народа.

Прынцып народнасці меркаваў:

а) кіраўніцтва і нагляд за нацыянальным суверэнітэтам;

б) аднаўленне велічнасці турэцкай цывілізацыі;

в) устанаўленне сілы і панавання закона для ўсіх [4].

На з'ездзе партыі ў 1934 г. некалькі канкрэтызавалі прынцып народнасці. Новая рэдакцыя адмаўляла наяўнасць класаў і класавай барацьбы, рэгіяналізму і феадалізму. Гэты прынцып быў пакладзены ў аснову Канстытуцыі краіны. У ёй адзначалася, што суверэнітэт і кіраванне належаць сапраўднаму гаспадару краіны – народу [5].

Характарызуючы выканальніцкую ўладу краіны, турэцкі лідэр адзначаў, што ўрад не з'яўляецца сацыялістычным. Ён не падобны ні на адну з тэарэтычных мадэлей, апісаных у навуковых працах. Яго можна вызначыць як народны [6]. Прынцып народнасці прасякнуты духам утапізму і ідэалізму. Яго палажэнні адарваны ад рэальнага жыцця, працэсаў грамадскага развіцця. Гэту думку пацвярджае турэцкі даследчык Себахецін Селек, які лічыць, што народнасць кемалістаў у рэальнасці ніколі не існавала, а была толькі фантазіяй і слабым перайманнем [7].

Прынцып лаіцызму меркаваў аддзяленне мусульманскай рэлігіі ад палітыкі і дзяржавы. Французскі даследчык Жан-Поль Ру, даследуючы іслам, звяртаў увагу на яго верацярпімасць у туркаў. Пасля пяцісот гадоў турэцкай акупацыі Балканы не толькі не падвяргаліся атурэчванню, але і не прынялі іслам. Асманская імперыя прызнавала ўсе рэлігіі і адпавядаючыя ім правы. У якасці прыкладу можна прывесці ўказ Селіма II ад 1572 г. У ім наказвалася абараняць жыхароў ва ўсіх іх справах з дзяржавай, якія датычацца падаткаў або правасуддзя, забяспечваць іх шчасце і росквіт. Гонар дзяржавы патрабуе забяспечыць іх бяспеку і абарону [8].

Верацярпімасць апасродкавала працэс дэмакратызацыі палітыкі і стварэнне свецкай дзяржавы. У кемалізме рэлігія аб'яўлялася справай сумлення. Яна павінна быць аддзелена ад дзяржавы, каб нацыя магла стаць на шлях сучаснай цывілізацыі. У грамадскім і нацыянальным жыцці прыналежнасць любога чалавека да любой сістэмы вераванняў сама па сабе не з'яўляецца ні дабрачыннасцю, ні недахопам з пункту погляду яе абавязку перад грамадствам і перад нацыяй [9].

Прынцып лаіцызму адпавядаў характару руху за еўрапеізацыю турэцкага грамадства. Ён устанаўліваў дэмакратыю заканадаўчым шляхам без уліку меркавання народа. Прыхільнікі свецкай дзяржавы ўяўлялі меншасць бюракратаў, блізкую да цэнтральнай улады. Больш таго, яны не карысталіся ніякай падтрымкай у грамадстве і якога-небудзь сацыяльнага класа. Лаіцызм як ідэалагічны рух у абарону свецкай дзяржавы, як і ўсе рухі, з'яўляўся доляй самага перадавога сацыяльнага слоя – інтэлігенцыі.

Прынцып нацыяналізму ў кемалісцкай ідэалогіі мяркуе захаванне асноў дзяржавы, а таксама яе незалежнасці, дазваляе рухаць яе ўперад па шляху прагрэсу і развіцця ў згодзе з іншымі сучаснымі народамі. Нацыяналізм адмяжоўваецца ад панісламізму, панцюркізму і панасманізму. Ён прызначаны для ўсіх туркаў, якія жывуць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

у межах нацыянальных граніц, але не адчувае брацкіх пачуццяў да ўсіх іншых цюркаў, якія жывуць за межамі гэтых граніц. Ён супрацьстаіць любой іншай палітычнай пазанацыянальнай плыні. Турэцкі нацыяналізм адкрыты для ўсяго чалавецтва і для ўсіх народаў, ён адказвае прынцыпам, якія аб'ядноўваюць усіх людзей, што выхаваны на цюркскай культуры і гавораць на цюркскіх мовах.

Прынцып этатызму мяркуе ўмяшальніцтва дзяржавы ў развіццё краіны з мэтай забеспячэння пад'ёму эканамічнага, сацыяльнага жыцця. Дзяржаўнае ўмяшальніцтва меркавала аказанне падтрымкі прыватнаму прадпрымальніцтву і ў той жа час прадугледжвала парытэт у адносінах да сацыяльных структур. Кемалізм генерыраваў свой шлях эканамічнага развіцця, які дыстанцыраваўся ад ліберальнай і камуністычнай ідэалогіі. Гэтыя тэарэтычныя пастулаты, як правіла, не супадалі з практыкай эканамічнага развіцця. На практыцы этатызм меркаваў развіццё змешанай эканомікі. Прычым на розных этапах эканамічнага развіцця доля ўмяшальніцтва была рознай. Як мы ўжо адзначалі вышэй, не толькі ў палітыцы, але і ў эканоміцы кемалізм запазычваў вопыт развіцця савецкай дзяржавы. Індустрыялізацыя турэцкай эканомікі дазволіла стварыць трывалы фундамент незалежнасці. Нацыяналізацыя прамысловых прадпрыемстваў меркавала стварэнне новай цюркінізаванай сацыяльнай базы ў гэтай галіне эканомікі. Прыхільнікі кемалізму безупынна сцвярджалі, што іх этатызм не мае нічога агульнага з сацыялізмам.

Карэннае адрозненне мадэлей заключаецца ў наяўнасці платформы эканамічных і сацыяльных пераўтварэнняў. Савецкая мадэль развіцця выкарыстоўвала дыктатуру пралетарыяту ў якасці сацыяльнай базы, а кемалізм – увесь народ. Кемалісцкая палітычная эканоміка, не жадаўшая з'яўлення прывілеяванага класа, тым не менш садзейнічала развіццю капіталізму і з'яўленню класа буржуазіі.

Так званы «ўзважаны этатызм» у кемалісцкай ідэалогіі быў магчымы на стадыі першапачатковага развіцця капіталізму. У выніку яго развіцця любыя разважанні аб сацыяльным парытэце і гармоніі турэцкага грамадства былі беспадстаўнымі.

Тэндэнцыі развіцця бяскласавага грамадства і сацыяльная непрадузятасць садзейнічалі ўзмацненню пазіцый турэцкай бюракратыі і ваенных. Яшчэ з часоў Асманскай імперыі армія, ваенныя складалі аснову прывілеяванага класа. Кіраванне імперыяй належала гэтаму саслоўю. Такое становішча разам з ваеннай сілай давала магчымасць арміі ўмешвацца ў дзяржаўныя справы і вызначаць вектар палітычнага развіцця. Так, упершыню армія заявіла пра сябе як пра палітычную сілу ў 1908 г., калі па яе патрабаванні ўлада дзеючага манарха была абмежавана. Выдатныя прадстаўнікі кемалісцкага руху *былі ваеннымі, і з гэтай прычыны ідэі пераўтварэння* грамадства сталі здабыткам узброеных сіл. У перыяд стварэння рэспублікі ваенныя ў асобе паслядоўнікаў кемалізму набылі рэальную ўладу. Звяртаючыся ў пасланні да моладзі і ваенных, Атацюрк адзначаў, што іх задача заключаецца ў абароне нацыянальнай незалежнасці Турэцкай Рэспублікі. Гэта пасланне абавязвала армію быць гарантам бяспекі і палітычнай стабільнасці краіны. Па сутнасці, Атацюрк санкцыяніраваў умяшальніцтва арміі ў справы дзяржавы. Традыцыя ж дэмакратынай дзяржавы мяркуе выкарыстанне ўзброеных сіл для абароны свайго нацыянальнага суверэнітэту ад знешніх пагроз. Армія не ўмешваецца ва ўнутраныя справы, у палітычны працэс. У процівагу гэтаму становішчу пасланне Атацюрка абавязвае яе кіравацца кемалісцкімі прынцыпамі і забяспечваць стабільнасць унутры дзяржавы. Армія не магла забяспечыць знешнюю бяспеку краіны. Яна была вельмі слабай, бо эканоміка краіны не была дастаткова моцнай. Армія актыўна ўмешвалася ў дзяржаўныя справы. У якасці прыкладу можна прывесці дзяржаўныя перавароты 1960 і 1980-х гг. У адрозненне ад ваенных пераваротаў у іншых краінах, дзе армія з'яўлялася зброяй у руках алігархіі і імкнулася захапіць палітычную ўладу, турэцкая армія не ставіць перад сабой задачу валодаць ёю. Турэцкая армія забяспечвае палітычную стабільнасць, рэалізацыю кемалісцкіх прынцыпаў еўрапеізацыі краіны. Выканаўшы сваю ролю, армія кожны раз мірна вярталася ў казармы. Кемалісцкая армія кіравалася не Канстытуцыяй, а сістэмай прынцыпаў галоўнай дзеючай асобай, выканальнікам якіх з'яўляўся афіцэр. Дэградацыя аднаго з прынцыпаў «улады народа» і ўступкі радыкальным ісламістам на шкоду прынцыпам свецкай дзяржавы з'яўляецца падставай для ўмяшальніцтва ваенных у палітычнае жыццё краіны. Хоць сам народ у большасці сваёй негатыўна адносіўся да пераваротаў і не ўспрымаў кемалісцкія прынцыпы.

Тым не менш, на працягу значнага перыяду яму пыходзілася мірыцца з прысутнасцю арміі ў палітычным жыцці краіны. Грамадства апынулася перад дылемай захавання ўкараніўшыхся рэлігійных традыцый ці ж успрымання кемалісцкіх прынцыпаў рэвалюцыйнага пераўтварэння. Разумеючы гэта, армейскія афіцэры бралі ўладу ў свае рукі, прытрымліваючыся кемалісцкага лозунга: «У імя народа – насуперак народу». Не карыстаючыся падтрымкай большасці грамад-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ

ства, кемалісты імнуліся ўкараніць дэмакратыю і шляхам яе пераламаць сітуацыю на сваю карысць. Была распрацавана новая рэдакцыя Канстытуцыі, адноўлены паўнамоцтвы палітычных партый, створаны Канстытуцыйны суд. Дэмакратычныя пераўтварэнні, дыверсіфікацыя палітычнага жыцця спрыялі актывізацыі ісламісцкіх сіл, якім сімпатызавала большасць грамадзян. У пачатку 70-х гг. мінулага стагоддзя намеціўся некаторы кампраміс паміж кемалісцкай партыяй і радыкальнымі ісламістамі. Пасля чарговага перавароту 1980 г. у Канстытуцыю краіны былі ўнесены новыя папраўкі, якія дазвалялі выкладанне рэлігійных дысцыплін. Палітычныя партыі ісламісцкага толку імкнуцца забяспечыць баланс паміж тэакратыяй і дэмакратыяй. Яны выступаюць за ўстанаўленне шарыяту дэмакратычным шляхам. Апаненты кемалізму крытыкуюць яго ў непаслядоўнасці, у адсутнасці логікі палітычнага развіцця. Сцвярджаюць, што кемалісты стварылі нейкую псеўдадзяржаву, якая з'яўляецца ні свецкай, ні дэмакратычнай. Французскі даследчык Морыс Дзювержэ адзначаў, што кемалізм з'яўляецца не толькі асобным момантам турэцкай гісторыі, ён стаў тыпам палітычнай сістэмы. Сістэма яшчэ дастаткова дрэнна вызначана, урэшце, ёй немагчыма прыдаць такую ж дакладную схему, як камунізму ці заходняй дэмакратыі, але яна вельмі важная сістэма, бо натхняе больш і менш непасрэдна большую частку дзяржаў «трэцяга свету», якія не знаходзяцца ў арбіце Масквы ці Пекіна [2]. Сапраўды, кемалізм стварыў такую мадэль палітычнай сістэмы, пры якой палітычныя інстытуты адчуваюць уплыў традыцыі. Турэцкая дзяржава пастаянна адчувае ўплыў узброеных сіл, якія вызначаюць стратэгію развіцця краіны на аснове прынцыпаў кемалізму.

Саперніцтва кемалізму і ісламу дазволіла стварыць такую мадэль палітычнай сістэмы, якая ўраўнаважвае інтарэсы грамадства і дзяржавы. Яна з'яўляецца паказальнай для краін, у якіх існуюць сур'ёзныя цяжкасці, праблемы ў вызначэнні месца і ролі рэлігіі ў палітычнай сістэме. Гэты феномен характэрны не толькі для цюркамоўных постсавецкіх краін, але і тых, якія імнуцца стварыць сваю унікальную мадэль палітычнай сістэмы. Турэцкі вопыт станаўлення свецкай дзяржавы з'яўляецца важным і паказальным. Мадэль палітычнага развіцця садзейнічае збліжэнню цюркамоўных краін у адзіную садружнасць.

Літаратура

1. *Шахинлер, М.* Кемализм: зарождение, влияние, актуальность / М. Шахинлер. – М., 1999. – С. 21, 88, 92, 98, 101.
2. *Дюверже, М.* Политические партии / М. Дюверже. – М., 2000. – С. 145.
3. *Tongas, G.* La philosophie kemalisme dans Commision nationale torque pour l'Unesco / G. Tongas. – Ataturk, 1968. – P. 277.
4. *Selek, S.* Anadoul ihtilati / S. Selek. – Istambul, 1969. – С. 402.
5. *Roux, J.-P.* Histoire des Turcs / J.-P. Roux. – Paris, 1984. – С. 132.

Summary

The principles of Gemalistic ideology and heir influence on the formation and development of the secular State are examined their the article.

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

УДК 32.001:008

А.І. Лысюк

ІМІДЖ ПАЛІТЫЧНАГА ЛІДЭРА Ў ПРАЦЭСАХ КУЛЬТУРАЛАГІЧНАЙ ІДЭНТЫФІКАЦЫІ

У сучаснай палітычнай навуцы паняцце іміджу з'яўляецца адным з найбольш часта ўжывальных. Асноўная прычына – высокая ступень персаніфікацыі і віртуалізацыі палітычнай прасторы, стымулюючая сацыяльны попыт на іміджы палітычных персон.

Разам з тым сам працэс уплыву іміджаў палітычных лідэраў на даследчыкаў вывучаны недастаткова. Справа ў тым, што існуючыя даследаванні робяць акцэнт на аналізе псіхалагічных характарыстык падобнага ўплыву [3–5]. Відавочна, што паколькі родавай сутнасцю чалавека, сацыяльных адносін з'яўляецца культура, то, такім чынам, менавіта культуралагічныя кампаненты адыгрываюць у ім ключавую ролю. Аналіз працэсу культуралагічнага ўплыву лідэра на паслядоўнікаў на ўзроўні іміджу з'яўляецца мэтай дадзенага артыкула.

Імідж у сацыяльных навуках звычайна вызначаецца як «целостный, качественно определенный образ данного объекта, устойчиво живущий и воспроизводящийся в массовом и/или индивидуальном сознании» [6, с. 359].

Паняцце іміджу выкарыстоўваецца адносна розных сацыяльных суб'ектаў. Яго спецыфіка ў адносінах да феномена палітычнага лідэрства выражаецца ў тым, што ён разглядаецца ў якасці штучна сканструяванага аб'екта ў адпа-